# За межы майстэрні

## Чым здольныя здзівіць айчынныя дызайнеры?

Выбар стылю ў адзенні, пошук трэндавых мадэлей — важны складнік жыцця. Прымаўка «сустракаюць па адзенні» актуальнасці не згубіла, а, наадварот, стала пэўным лейтматывам пры розных сітуацыях — пошуку працы, паходзе ў тэатр, нават для прагулкі вопратка павінна быць адпаведнай.

Што ў модзе сёлета: лёгкія спадніцы мідзі альбо штаны-бойфрэнды, які колер выступае як хіт сезона — ружовы кварц альбо «сірэніці» (спакойна-блакітны) — усё гэта вырашаюць дызайнеры з сусветным імем. Менавіта да іх прыслухоўваюцца модніцы розных краін, за іх мадэлямі едуць за мяжу. Але ж у выніку бясконцай «гонкі за стылем» многія перастаюць заўважаць, што ёсць шмат цікавага ў скарбонцы ідэй айчынных дызайнераў.

А яны (у нашым выпадку) прапаноўваюць абсалютна ўнікальныя рэчы, здольныя скласці канкурэнцыю замежным брэндам, па-першае, па якасці, па-другое, па тэхніцы выканання. Напрыклад, на мінулым тыдні ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» на агляд сталічнай публікі прадставіла калекцыю аўтарскіх работ «Свой стыль» дызайнер з Маладзечна Людміла Хрол, якая, па меркаваннях гасцей выстаўкі, прэтэндуе на тое, каб яе мадэлі адзення выйшлі за межы творчай майстэрні.

Трывіяльнасці ў яе работах няма зусім, а вось «свой стыль» бачны ў кожным элеменце. Пачынаецца ўсё з жаночых сумак, прадстаўленых у розных стылёвых рашэннях. Ёсць спартыўныя, вырабленыя з джынсавага матэрыялу, ёсць класічныя, прызначаныя для сур'ёзных падзей. Ёсць і сумкі з ручной вышыўкай, што надае элегантнасці, вытанчанасці. Далей наведвальнікаў чакаюць вязаныя касцюмы і сукенкі разам з накідкамі. Мадэлі ўніверсальныя, падыдуць для прыхільніц моды любога ўзросту. Ёсць, канечне, і экспанаты, створаныя спецыяльна для старэйшага пакалення. Тут перавагу мае класічны падыход, які ў любы час застаецца ў трэндзе. Да многіх трыкатажных камбінацый прыкладаюцца галаўныя ўборы, а вязаныя сукенкі прывабліваюць і арыгінальным дызайнам, і асобнымі дэкаратыўнымі элементамі. Іх стрыманыя светла-кафейныя адценні надаюць мадэлям асаблівы стыль.

Глядзіш на экспанаты і здзіўляешся, адкуль у аўтара столькі ідэй і натхнення, бо працэс сапраўды крапатлівы, цяжкі. Гэта вынік усё тых жа модных тэндэнцый альбо ўласная фантазія, талент? Наколькі сучасныя беларускія жанчыны зацікаўленыя такімі рэчамі? На гэтыя пытанні карэспандэнту «ЛіМа» адказала Людміла Хрол:

— Я не ігнарую моду, заўсёды сачу за тэндэнцыямі. Але ўсё ж імкнуся ствараць мадэлі, якія могуць вельмі доўга заставацца стыльнымі і актуальнымі. Калі аддаеш шмат сіл, немагчыма рабіць аднадзёнкі, таму я ўсё дэталёва прадумваю. Хочацца, каб рэч служыла доўга, каб яна была з утульных, натуральных матэрыялаў і, вядома ж, адпавядала ўнутранаму свету чалавека. Стварэнне адзення падобна стварэнню скульптуры. Ты пачынаеш нешта ляпіць з кавалачка тканіны, а ў выніку атрымліваеш рэч, якая аблягае чалавека як другая скура, адпавядае не толькі запытам спажыўца, але і яго тэмпераменту, нават псіхалагічнаму стану.



*Дызайнер Людміла Хрол.*

Дызайнер перакананая, што ў выніку чалавек мяняецца не толькі звонку, але і знутры. У працэсе работы Людміла доўга размаўляе з жанчынамі і спрабуе зразумець, які стыль ім падыходзіць. Але эксперыментуе толькі з тымі, хто гатовы працаваць над сабой.

Усе жаночыя мадэлі дызайнера накіраваны на пазіцыянаванне жаноцкасці як сімвала прыгажосці і непаўторнасці. У экспазіцыі не сустрэнеш афіцыйна-дзелавых касцюмаў альбо строгіх спадніц. Мадэлі лёгкія і абсалютна разнастайныя. Становіцца цікава, ці можна такое адзенне выпусціць на айчынны рынак, ці ёсць у гэтым сэнс? На гэты конт у Людмілы Хрол сваё меркаванне:

— Элементы дызайнерскай творчасці на рынак выпусціць можна, але такая творчасць не можа быць рыначнай. Сёння многія прывозяць брэндавае адзенне з розных краін свету, не зважаючы на тое, што ёсць у нас. Дык наколькі актуальны маштабны занятак індывідуальным мадэляваннем адзення?

Экспазіцыя «Свой стыль» — магчымасць не толькі для аўтара прадставіць работы шырокай аўдыторыі, але і шанс для беларусаў пераасэнсаваць стаўленне да прапаноў айчыннай дызайнерскай індустрыі. Выстаўка закранула праблемы выхаду айчынных мадэляў на шырокую прастору, дала нагоду для разваг. Адзінае, чаго не хапала гледачу на адкрыцці праекта, — каб аўтарскія мадэлі былі прадстаўлены не на манекенах, а ў выглядзе дэфіле.

**Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ